*вядомыя ўсім непрыстойныя словы і лаянка і ці сустракаецца ў іх «ў» замест звычайнага. Калі вы атрымаеце станоўчыя вынікі, дык, не марудзячы ні хвіліны, вы, як даследчык, маеце права зрабіць вывад: 1) фармальныя навыкі ёсць (калі можна разабраць, што напісана), 2) усе дзеці ахоплены школай (калі на ўсіх варотах) і 3) беларусізацыя праходзіць здавальняюча (калі, хоць і рэдка, сустракаецца «ў»)* [1, с. 117–118].

На заключным этапе студэнты абгрунтоўваюць мэтазгоднасць ужывання алагізмаў, вызначаюць функцыянальную нагрузку наўмысных лагічна-сэнсавых памылак у рамане (маўленчая характарыстыка персанажа, стварэнне камічнага эфекту).

Вопыт паказвае, што займальны характар практыкаванняў садзейнічае эфектыўнаму засваенню вучэбнага матэрыялу, фарміраванню навыкаў лагічна-сэнсавага аналізу тэксту, надае заняткам неабходную дынаміку, павышае прадуктыўнасць працы.

**Літаратура**

1. Мрый, А. Творы: раман, апавяданні, нататкі / уклад. і прадм. Я. Лецкі.– Мінск: Маст. літ., 1993.– 317 с.

2. Редакторская подготовка литературно-художественных изданий: курс лекций для студентов специальности 1–47 01 01 Издательское дело / сост. Д. П. Зылевич.– Минск: БГТУ, 2014 [Электронный ресурс].– Режим доступа: https://elib.belstu.by/handle/123456789/12072.– Дата доступа: 24.06.2019.

УДК 821.161.3.09 (092)

І. Л. Іконнікава, магістр філал. навук
(ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, г. Мінск)

## ВОБРАЗ МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА

Малая радзіма ў творчасці Георгія Марчука – неад'емная частка прасторы яго твораў. Праз пейзажныя апісанні Давыд-Гарадка (а менавіта гэта мястэчка з'яўляецца месцам нараджэння пісьменніка) і яго мясцінаў, характарыстыку бытавога ўкладу, раскрыццё асаблівасцей псіхалогіі палешукоў, экскурсы ў гісторыю рэгіёна і ствараецца яе трывалы вобраз.

Для большасці людзей малая радзіма – месца, якое асацыіруецца з домам і сям'ёй. Яно навявае настальгічныя ўспаміны, бо з ім звязана памяць дзяцінства. Роднае мястэчка выклікае

ў мастака цёплыя і станоўчыя пачуцці, якія часам могуць быць ахутаны і сумам незваротнасці. Па-майстэрску яскрава вобраз малой радзімы адлюстраваны ў аўтабіяграфічных творах Георгія Марчука – цыкле «Давыд-гарадоцкія каноны» і рамане «Кветкі правінцыі».

Малая радзіма – своеасаблівы феномен, які дэтэрмінуе паводзіны чалавека, вызначае яго псіхалагічныя асаблівасці і садзейнічае ўкараненню ў свядомасці маральна-духоўных арыенціраў і каштоўнасцей. Асоба фарміруецца ў сацыякультурным асяродку, што праяўляецца ўключэннем яе ў групу жыхароў пэўнага рэгіёна, а гэта, у сваю чаргу, дазваляе вылучаць адрозныя рысы, характэрныя дадзенай групе. У рамане «Кветкі правінцыі» Г. Марчук са шчырай гордасцю і павагай апісвае местачкоўцаў: «Дбайныя, руплівыя, працавітыя, кемлівыя і хітрыя (гандаль навучыць быць і гаварлівым, і хітрым) гарадчукі невядома з якіх часоў навучыліся дубіць скуры, шыць кажухі, касцюмы, сукенкі, спадніцы, рабілі граблі, бочкі, плялі кашы, сеткі, жакі, кавалі падковы, цвікі, капаніцы, завесы, нажы, доўгія ключы, шылі зімовыя шапкі, паліто і чобаты, асабліва чобаты» [2, с. 25]. Падобныя дэталі неаднаразова падкрэсліваюцца як у рамане, так і ў цыкле эсэ, сустракаюцца і ў іншых творах (дылогія «Крык на хутары»).

Не менш значны ўплыў на станаўленне асобы аказвае прырода, у прыватнасці рака Гарынь (тут размова ідзе пра каштоўнасці жыхароў Давыд-Гарадка, што праецыруецца на беларусаў увогуле). Ва ўспрыманні Гарыні аўтарам адбіўся яго ўласны досвед дзяцінства. Прысутнасць ракі ў жыццёвай прасторы чалавека ўзбагачае яго разнастайнымі сувязямі з наваколлем, прыладамі працы, прадметамі ўжытку. Рака «як частка роднай прыроды задавальняе патрэбу беларуса-палешука не толькі ў штодзённым і матэрыяльным, але і высокім, таямнічым і прыгожым, схіляе да роздуму аб жыцці і яго хуткаплыннасці, дапамагае асэнсаваць кошт радасці і гора, повязь усяго, што існуе ў свеце,– ад жыццёвых клопатаў да вечных ісцін» [1, с. 28].

Гарынь злучала мястэчка, якое «закінута Богам у непраходныя балоты з вечна гразкімі, непралазнымі дарогамі» [2, с. 26], са светам. Рака ў творчасці аўтара не проста паэтызуецца, а становіцца дзеючай асобай, уплывае на лёсы персанажаў. Тут можна прыгадаць выпадак, калі аднойчы вясной паводка вымусіла Адася Долю разам з бабуляй («Кветкі правінцыі»)

на пэўны час памяняць месца жыхарства. Яна навявае ўспаміны, падштурхоўвае да філасофска-медытатыўных разваг пра сэнс жыцця. Гарынь становіцца маўклівай сведкай таго, што адбываецца ў мястэчку, заўважае тое, што гарадчукі пакінулі па-за сваёй увагай. Найбольш яскрава Гарынь прадстаўлена на старонках дылогіі «Крык на хутары», рамана «Кветкі правінцыі», навелы «Начная рыбалка», літаратурна-філасофскага эсэ «Канон Гарыні». У апошнім творы рака паэтызуецца. Гарынь успрымаецца жыхарамі як жывая істота, старэйшая сястра. У эсэ знаходзім радкі: «Рака не чалавек, яна злой не бывае <...>. Ракой не грэбуюць і не абагаўляюць, як дзе-небудзь, проста ставяцца да яе паважна, як да старэйшай сястры» [2, с. 384]. Для аўтара яна – «ціхая гаспадыня гарадка», якая выступае «як сімвал вечнага жыцця, як памочніца, як таямніца, як райская асалода, як доктар, які лечыць бясплатна, здымаючы нервовы стрэс, і як гонар» [2, с. 386].

Родныя мясціны для пісьменніка маюць вялікае, можна нават сказаць, сакральнае значэнне (запавет быць пахаваным у «зямлі продкаў»– адзін з рудыментаў такой сакралізацыі): мастак выказвае жаданне быць пахаваным «у роднай зямельцы на старэнькіх могілках» ці каля царквы, каб хоць «духам, ценем, а ўсё быць бліжэй да Гарыні хуткаплыннай», бо «як гэта прыемна – быць сярод таго, што ўтварыла характар, паўплывала на пачуцці і замацавала адметнае» [2, с. 410].

«Кветкі правінцыі» вызначае значная сацыяльная праблематыка. Улюбёнага ў свой родны Давыд-Гарадок, з яго традыцыйным укладам жыцця, Г. Марчука не можа не турбаваць будучыня мястэчка. Гэта абумовіла з'яўленне старонак рамана, дзе пісьменнік разважае пра лёс мілых сэрцу мясцін, калі ставіць пытанне аб развіцці вёсак і малых гарадоў у пасляваенны час, вырашэнне пытання прыватнага кветкаводства. Спаконвечнае традыцыйнае вырошчванне кветак з мэтай далейшага продажу насення было «забаронена». У Давыд-Гарадку, як і ва ўсім Столінскім раёне, быў уведзены каранцін, што не дазваляў вываз насення без адпаведных сертыфікатаў, якія ўлада не выдавала «прадпрымальнікам». Аўтар разам са сваімі героямі шчыра засмучаны і пратэстуе супраць такога рашэння чыноўнікаў. Глыбока занепакоены мастак і экалогіяй роднага Палесся. Ён не можа прыняць знішчэння прыроды, якая з'яўляецца часткай светаўспрымання родных мясцін, выступае супраць

меліярацыі: «мне трошкі крыўдна і сорамна <…>, што я бездапаможны і бяссільны ўратаваць для свайго гарадка Гарынь <…>. Меліяратары з дазволу высокага кіраўніцтва адводзяць нашу Гарынь, зменьваюць яе русла. І застанецца гарадок мой сіратою, як чалавек» [2, с. 258].

Своеасаблівым працягам рамана «Кветкі правінцыі» з'яўляецца цыкл літаратурна-філасофскіх эсэ «Давыд-гарадоцкія каноны», якія займаюць асаблівае месца ў творчасці мастака. Каноны складаюцца з 10 твораў, кожны з якіх насычаны філасофскімі развагамі пра сэнс існавання чалавека на зямлі. Тут цесна пераплятаюцца філасофія і жыццёвыя клопаты людзей, у прыватнасці давыд-гарадчукоў. Кожнае з эсэ раскрывае нейкі адзін з найбольш значных складнікаў светаўспрымання местачкоўца: Бог, маці, хата, Гарынь, вуліца, базар.

Г. Марчук на старонках сваіх твораў паказвае палескае мястэчка з яго самабытным укладам. Пісьменніка цікавяць не толькі асаблівасці ландшафту, але і гісторыя, традыцыі і звычаі, мова. Аўтар імкнецца да дэталёвага і ўсебаковага паказу паўсядзённага жыцця давыд-гарадчукоў, скіроўваючы сваю ўвагу як на матэрыяльную, так і на духоўную сферы, што дазваляе стварыць цэласны вобраз мястэчка Давыд-Гарадок.

Такім чынам, утварэнне вобраза малой радзімы ў творах Г. Марчука адбываецца праз прызму асобы пісьменніка, якая сфарміравалася пад уплывам пэўнага рэгіёна з яго сацыякультурнымі традыцыямі. Гэты вобраз акумулюе ў сабе духоўны свет чалавека-мастака. Любоў да малой радзімы змяшчае ў сабе тры найбольш важныя складнікі: рака – мястэчка – людзі. Перадача рэгіянальнага каларыту ў творах Г. Марчука набывае духоўна-эстэтычную значнасць і раскрывае адметнасць этнакультурнай спадчыны гарадчукоў.

**Літаратура**

1. Белая, А. І. Вывучэнне творчасці Георгія Марчука ў школе // Беларуская мова і літаратура.– 2009.– № 2.– С. 26–32.

2. Марчук, Г. Кветкі правінцыі: раман, навелы, афарызмы.– Мінск: Маст. літ., 2004.– 416 с.